Радыё Свабода

ПАЛІТЫКА

Віцебск: кіраўніцтва раённай выбарчай камісіі дэлегавалі на Ўсебеларускі сход

08 лістапад 2010, 23:55

Радыё Свабода

На паседжаньні выбарчай камісіі Кастрычніцкага раёну старшыня камісіі Мікалай Канявалаў, яго намесьнік Уладзімер Арэхва і сакратар Ірына Мянчэня атрымалі віншаваньні. Усе трое абраныя дэлегатамі 4-га Ўсебеларускага сходу.

Ад кожнага раёну дэлегаваныя прыблізна па тры дзясяткі чалавек. Сярод вылучэнцаў Кастрычніцкага раёну апынулася ўсё кіраўніцтва раённай выбарчай камісіі.

Мікалай Канявалаў узначальвае віцебскае прадпрыемства «Дзяржбудэкспэртыза ў Віцебскай вобласьці», **Уладзімер Арэхва** кіруе Віцебскім дыягнастычным цэнтрам, **Ірына Мянчэня** — намесьніца дырэктара дапаможнай школы № 26.